# Школьная планета

**_НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!_**

**_№ 3 (50) ЛІСТАПАД 2018_**

_Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно" Мінскай вобласці_




**_9 лютага Прэзідэнт РБ Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка паведаміў, што 2018 год у Беларусі вырашана абвясціць Годам малой радзімы. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што на прыняцце такога важнага рашэння падахвоцілі разважанні аб важнасці малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека. «Яна шматаблічная. Для адных гэта родны горад, вуліца ў горадзе або невялікі дворык, вёска, дзе прайшлі лепшыя дзіцячыя гады, для іншых — кавалачак дзікай прыроды, які цешыў вока і дарыў пачуццё напоўненасці і спакою. А для тых, хто з'ехаў шукаць шчасця ў іншыя краіны, малой радзімай стала Беларусь», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка._**

**_Прэзідэнт падкрэсліў, што прыйшоў час кожнаму не толькі ўзгадаць аб сваіх каранях, аб месцы, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалку зямлі. «Вельмі хочацца, каб дапамога ішла ад сэрца, стала ўласнай ініцыятывай. Яна можа быць матэрыяльнай, стваральнай, асветніцкай, творчай — хто як можа і хто колькі можа. Залежыць ад магчымасцяў, фантазіі і жадання кожнага. Надышоў момант праявіць сябе і ўпісаць сваё імя ў гісторыю гэтай малой радзімы, гэтага кавалачка нашай зямлі», — заявіў ён._**









Пракокі нацыі, канешне, па-рознаму ўвасаблялі родную старонку. Пятро Глебка, напрыклад, Беларусь бачыў убранай у шчодрыя каласы:

***Цяпер убрана ты квяціста,***
***Пад колер слуцкіх паясоў,***
***У строі нівы залацістай,***
***У шаты грэчак і аўсоў…***



Пятро Глебка (1905 - 1969) — беларускі паэт, драматург, перакладчык. Акадэмік АН Беларускай ССР. Член Саюза пісьменнікаў СССР.



***Фота Паліны Маркевіч***

# Горад Беразіно



У тапанімічным слоўніку Беларусі можна прачытаць, што горад размешчаны на беразе ракі Беразіны і названы па назве ракі.

Вучоныя звязваюць паходжанне гэтай назвы з найстаражытнейшай асновай – словам «бераг». Сапраўды, не ўсе рэкі ў Беларусі маюць цвёрдыя, надзейныя берагі. У доказ праваты сваёй здагадкі вучоныя паведамляюць, што па берагах Заходняй Беразіны сустракаюцца назвы паселішчаў Берагавыя, Забер'е, Забярэжжа, Узбярэжжа, Беражкі.

# Рака Беразіна



Аб паходжанні назвы ракі Беразіна таксама ходзяць спрэчкі, існуюць розныя здагадкі.

Вядома і легенда аб паходжанні гэтай ракі, згодна з якой “проці млына за Докшыцамі расла бяроза, а свіння пад ёй усё рыла, рыла і дарылася да вады. Дык тады і пайшла рака, яе пагэтаму і назвалі Бяроза” (Беразіна сапраўды бярэ пачатак у Докшыцкім раёне).



*Кацярына Бубенька*
*Фота Надзеі Міхалёвай*

## *Янка Купала раіў нам:*
## *“Не шукай ты шчасця, долі.*
## *На чужым, далёкім полі”.*



Я́нка Купа́ла, сапр. Іван Дамінікавіч Луцэвіч (1882—1942) — беларускі паэт, драматург, публіцыст, перакладчык, класік беларускай літаратуры, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Народны паэт Беларусі. Акадэмік АН БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за зборнік «Ад сэрца».

## Ніл Гілевіч
## Калі рана ўстанеш…

Калі рана ўстанеш -
Разам з сонцам зыркім,
Што ўсплыве над зыбкім
Вогнішчам зары, —
Колькі ты пабачыш
З'яў жыцця дзівосных,
Колькі цудаў розных
Згледзіш на двары!
Калі рана ўстанеш —
Разам з ветрам буйным,
Што абудзіць струны
Неба, дрэў, травы, —
Колькі ты пачуеш
Гукаў-зыкаў дзіўных,
Звонаў пералiўных,
Спеваў харавых!
Калі рана ўстанеш —
Разам з першай птушкай,
Што шукае тут жа
Для дзяцей яды, —
Колькі ты паспееш
Памагчы слабейшым,
Падтрымаць, суцешыць,
Выручыць з бяды!
Калі рана ўстанеш —
Разам з мамай, татам
Ды за справу-працу
Возьмешся хутчэй, —
Колькі ты пазнаеш
Радасці нясцерпнай —
Аж да песні з сэрца,
Аж да слёз з вачэй!
Калі рана ўстанеш —
Разам з сонцам яркім,
Разам з ветрам шпаркім,
Разам з белым днём, —
Сам тады, мой дружа,
Разумець ты будзеш,
Для чаго мы, людзі,
На зямлі жывём!

## Ніл Гілевіч быў перакананы:
## "У глыбінях зямлі Нашых душ карані…"



Ніл Сымо́навіч Гіле́віч (1931 — 2016) — беларускі паэт, перакладчык, празаік, драматург, літаратуразнавец, фалькларыст і грамадскі дзеяч. Заслужаны дзеяч навукі БССР. Народны паэт Беларусі. Пасля смерці Рыгора Барадуліна ў 2014 годзе Ніл Гілевіч заставаўся апошнім жывым, хто меў званне Народнага паэта Беларусі.

# Год малой радзімы ў Беларусі

Малая радзіма – гэта месца, якое ёсць у жыцці кожнага чалавека; месца, дзе ты зрабіў свае першыя крокі; месца, дзе дасягнуты твае першыя перамогі; месца, з якім звязана шмат думак і ўспамінаў; месца, куды заўсёды хацеў бы вярнуцца; месца, якому наканавана застацца ў сэрцы кожнага назаўжды. Малая радзіма – гэта родны горад ці вёска, вуліца ці двор, хата ці кватэра. Малая радзіма – гэта твая сям'я, твае сябры.

Сёлетні год – Год малой радзімы – вельмі важны для нашай сучаснасці. Мы павінны разабрацца ў сабе і ўсвядоміць, дзе наша радзіма? Што яна для нас значыць? Праходзіць час, адбываецца змена пакаленняў, мяняюцца чалавечыя паводзіны, але пачуццё любові да радзімы павінна заставацца нязменным! І гэта ўласціва нашаму народу!

Любоў да радзімы перайшла да нас ад нашым бацькоў, дзедаў і прадзедаў. Наша задача – зберагчы гэту любоў у сабе і навучыць будучае пакаленне любіць і аберагаць сваю малую радзіму.

***Паліна Кузіна***

***Не сакрэт, што звычайныя рэчы – хата, рэчка і лес маленства, бацькоўскае поле – сталі для многіх беларусаў самымі святымі і пачэснымі. Яны клічуць нас да сябе ўсё жыццё. А, бадай, напрыпачатку зямной існасці – святло геніяльнай паэмы "Новая зямля" Якуба Коласа, сэнс якой мы будзем працягваць разгадваць усё XXI стагоддзе. Чаму? Бо:***

***Зямля дасць волі, дасць і сілы,***
***Зямля паслужыць да магілы,***
***Зямля дзяцей тваіх не кіне,***
***Зямля – аснова ўсёй айчыне…***

***У гэтай Паэме Зямлі ўсё ўбачана, ацэнена вачыма, розумам і светаадчуваннем беларускага селяніна, які заўсёды аднолькава любіў і Зямлю, і Неба.***

Яку́б Ко́лас, сапр. Канстанці́н Міха́йлавіч Міцке́віч (1882—1956) — беларускі паэт, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч; адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Народны паэт Беларусі. Акадэмік АН Беларусі. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі.





Іва́н Па́ўлавіч Ме́леж (1921—1976) — беларускі празаік, драматург, публіцыст. Народны пісьменнік Беларусі. Лаўрэат Ленінскай прэміі за раман «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы», Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа за зборнік «Жыццёвыя клопаты», Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа за раман «Людзі на балоце».

## “Родная зямля грэе і аберагае...”










*Малюнкі Анастасіі Бурай, вучаніцы 7 “А” класа*

# Бацькаўшчына светлая мая...












*Фота Надзеі Міхалёвай*

## *“У родным краю ёсць крыніца Жывой вады”*



Максі́м Ада́мавіч Багдано́віч (1891 - 1917) — беларускі паэт, публіцыст, літаратурны крытык, перакладчык, літаратуразнавец; класік беларускай літаратуры. Багдановіч выступаў як крытык і гісторык літаратуры. Распачынальнік традыцыі беларускага мастацкага перакладу. Нізка «Места» з адзінага прыжыццёвага зборніка паэта «Вянок» з'яўляецца першым узорам урбаністычнай лірыкі ў новай беларускай паэзіі. Спадчына Максіма Багдановіча ўвайшла ў залаты фонд беларускай культуры.

# Вандруем па Бярэзіншчыне...









***Фота Алены Аўтуховіч***

ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба “Юны журналіст”: Кацярына Бубенька, Паліна Кузіна, Паліна Маркевіч, Вікторыя Лапцёнак, Анастасія Бурая, Марына Лапцёнак, Аліна Жукоўская, Яна Сюмак